МГПУ им. И.П.Шамякина

# КАШТОЎНАСНА-СЭНСАВЫ ЗМЕСТ МАРАЛЬНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ ПЕДАГОГА

*А.В. Команава*

*(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, Мазыр)*

У сучасных даследаваннях кампетэнтнаснага падыходу сярод іншых змястоўных кампанентаў кампетэнтнасці вылучаюць каштоўнасна-сэнсавыя кампетэнцыі. Гэтыя кампетэнцыі грунтуюцца на адносінах асобы

да свету, яе жыццёвых каштоўнасцях, успрынятых нормах маральных паводзін, якія сталі асобаснымі сэнсамі. Яны абумоўліваюць устойлівасць асобы да знешніх уздзеянняў, забяспечваюць чалавеку захаванне ўласнай пазіцыі, здольнасці яго да адаптацыі ва ўмовах зменаў і творчай самарэалізацыі.

Асаблівае значэнне каштоўнасна-сэнсавы аспект кампетэнтнасці мае ў педагагічнай дзейнасці.

У вызначэнні прафесійнай кампетэнтнасці педагога мы зыходзім з таго, што дадзенае паняцце не зводзіцца толькі да набору педагагічна неабходных ведаў, уменняў і навыкаў, а азначае адзінства яго тэарэтычнай і практычнай падрыхтаванасці да ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці. Практычная падрыхтаванасць педагога будуецца на аснове ўнутранага прыняцця тэарэтычнага зместу педагагічнай дзейнасці. У ёй знаходзяць выражэнне глыбокія сутнасныя характарыстыкі яго асобы, якія прадстаўлены ў цэласным сістэмным утварэнні – прафесійна-асобаснай культуры настаўніка.

Сістэмаўтваральным кампанентам культуры асобы педагога і, такім чынам, стрыжнёвым кампанентам яго кампетэнтнасці з'яўляецца маральнасць. Роля гэтай кампетэнтнасці асабліва актуальная ў сучасных умовах грамадскага развіцця. Арганізацыя і ўдасканаленне сістэмы маральнага выхавання з'яўляецца сур'ёзнай праблемай сёння. У яе вырашэнні вядучая роля належыць настаўніку як суб'екту выхаваўчага працэсу. У адносінах да настаўніка маральнасць мае двайную накіраванасць. З аднаго боку, гаворка ідзе пра маральную дасканаласць яго асобы, з другога – аб яго здольнасці, аказаўшы пазітыўны ўплыў на асобу вучня, стварыць умовы для маральнага станаўлення і самарэалізацыі.

Сучасныя падыходы да вывучэння маральнасці і маральнага выхавання грунтуюцца на прынцыпах сэнсаўтваральнага ўплыву на асобу. Згодна з імі, сапраўдная маральнасць вымяраецца ўзроўнем маральнага развіцця асобы, калі існуючыя ў грамадстве нормы і прынцыпы маралі становяцца прынцыпамі сумлення чалавека. Педагагічная тэхналогія маральнага выхавання павінна быць арыентавана не толькі на нарматыўнае засваенне маральных правілаў, але і на прадастаўленне магчымасці маральнага выбару, калі неабходным становіцца глыбокае асэнсаванне, прыняцце ўнутраным светам асобы нормаў і патрабаванняў маралі грамадства. Маральная культура ўключае ў сябе маральную свядомасць, якая фарміруецца на аснове тэарэтычных ведаў, а таксама ўзровень развіцця маральных пачуццяў.

У працэсе фарміравання маральнага кампанента прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі будучага настаўніка неабходна весці гаворку аб ключавых кампетэнтнасцях як узроўнях праяўлення яго маральнага

МГПУ им. И.П.Шамякина

вопыту: інфармацыйнай, інтэлектуальна-педагагічнай, рэгулятыўнай і камунікатыўнай. У гэтай сістэме характарыстыкамі асноўнай кампетэнтнасці валодае інтэлектуальна-педагагічная, якая прадугледжвае ўзровень развіцця маральнага мыслення педагога. Гэтая кампетэнтнасць уключае ў сябе развіццё здольнасці да педагагічнага аналізу і сінтэзу, развіццё такіх якасцяў, як гнуткасць і крытычнасць мыслення, самастойнасць, актыўнасць, творчае ўяўленне. Гэтая кампетэнтнасць знаходзіць выражэнне ва ўменні прымяняць наяўныя веды для ўстанаўлення педагагічна мэтазгодных узаемаадносін у набыцці і пераўтварэнні ведаў, а таксама ў выпрацоўцы спосабаў творчай маральна-выхаваўчай дзейнасці.

Змест сучаснай педагагічнай адукацыі павінен забяспечваць аксіялагічнае развіццё асобы будучага настаўніка, што будзе вызначаць шляхі фарміравання яго індывідуальнай самасвядомасці і спрыяць самарэалізацыі ў прафесійнай сферы. Маральныя каштоўнасці змяшчаюць у сабе ўнутраны імпульс матывацыі педагога і праяўляюцца ў сістэме яго адносін. Гэтыя каштоўнасці ўтвараюцца на аснове іх глыбокага эмацыянальнага ўсведамлення. Таму прынцыпова важнай умовай для іх фарміравання з'яўляецца эмацыянальная адкрытасць і дынамізм адукацыйнага асяроддзя. Каб у поўнай меры рэалізаваць творчы падыход да маральна-выхаваўчай дзейнасці, педагог, акрамя імкнення да педагагічнай інтуіцыі, павінен валодаць здольнасцю да прафесійна апраўданых дзеянняў. Такім чынам, важным з'яўляецца пераход маральна-педагагічных каштоўнасцей у прафесійна-асобасныя прынцыпы педагога. Такі пераход магчымы праз працэсы самаактуалізацыі, якія будуць спрыяць развіццю самастойнай, творчай, самабытнай асобы, здольнай да вырашэння маральна-педагагічных сітуацый і праблем.

Для рэалізацыі акрэсленых вышэй падыходаў у сістэме падрыхтоўкі будучых педагогаў неабходна вырашэнне наступных задач:

– стварэнне адэкватнага адукацыйна-выхаваўчага асяроддзя, якое прадстаўляе ўмовы для засваення студэнтамі духоўна-маральных каштоўнасцей;

– прад'яўленне сістэмы маральных нормаў і патрабаванняў як каштоўнасцяў сацыякультурнай сферы, прафесійнага мыслення педагога і яго асобаснага патэнцыялу;

– садзейнічанне выпрацоўцы ў будучага педагога індывідуальнага стылю маральных паводзін;

– стварэнне ўмоў для раскрыцця будучым педагогам яго асобасных асаблівасцей, арганізацыя сітуацый свабоднага выбару і фарміравання вопыту маральных паводзін.

Літаратура

МГПУ им. И.П.Шамякина

1. Маслоу, А. Новые рубежи человеческой природы / А. Маслоу. – М.: Смысл, 1999. – 424 с.
2. Петушкова, Е.В. Целевая направленность и ценностные ориентиры гуманистического воспитания / Е.В. Петушкова // Праблемы выхавання. – 1997. – № 6. – С. 10–18.
МГПУ им. И.П.Шамякина